

# «ТРЭБА КІРАВАЦЬ РАЁНАМ, КАНКРЭТНА ПАКАЗВАЮЧЫ ВЫНІК»

**У кадравы дзень — асаблівая ўвага мясцовай уладзе**

(Стар. 2–3)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

15 ЖНІЎНЯ 2025 г. ПЯТНІЦА № 156 (30544)

ЖНІВО-2025

# «ПРАЦАВАЦЬ ТРЭБА ШЧЫРА І САМААДДАНА»

**І тады ўсё абавязкова атрымаецца**

Адкрытае акцыянернае таварыства «Азярыцкі-Агра» — ці не самая вядомая на сёння гаспадарка краіны. Двойчы за гэта жніво тут пабываў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка. Гаспадарка яшчэ і адна з самых паспяховых не толькі ў Мінскай вобласці, але і ў краіне.

Вядома, за значнымі паказчыкамі стаіць работа прафесіяналаў, людзей, якія добра ведаюць сваю справу і аддалі рабоце ў сельскай гаспадарцы не адзін дзясятак гадоў. Многія работнікі гаспадаркі перадалі любоў да прафесіі сваім дзецям і стварылі сямейныя працоўныя дынастыі. Мы пазнаёміліся з адной такой дынастыяй — камбайнераў Федарэнкаў.

СТАР. 8-9



Іван ФЕДАРЭНКА працуе механізатарам амаль трыццаць гадоў.

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.



НЕ ДЫЕТА — ПРАВІЛЬНАЕ ХАРЧАВАННЕ 10



ВОСЕНЬ НА ПАРОЗЕ? 16



**+TV ПРАГРАМА**

«ВАКЗАЛ ДЛЯ ДВАІХ»

АДУКАЦЫЯ

# КОЖНЫ ПЯТЫ БЮДЖЭТНІК — МЭТАВІК

**Міністэрства адукацыі Беларусі падвяло папярэднія вынікі ўступнай кампаніі 2025 года**

Прыёмная кампанія яшчэ не завершана, але набліжаецца да фінішу: скончыўся набор на ўзровень сярэдняй спецыяльнай, 23 жніўня завяршаецца прыём дакументаў на ўзровень прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Па словах начальніка галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі Міністэрства адукацыі Сяргея ПІШЧОВА, у каледжах яшчэ ёсць свабодныя месцы, таму абітурыенты, якія плануюць атрымаць рабочую прафесію, усё яшчэ маюць магчымасць гэта зрабіць. Але і гэта яшчэ не ўсё — у лістападзе-снежні будуць прымаць дакументы ў абітурыентаў, якія плануюць атрымаць адукацыю ў сельскагаспадарчых ВНУ краіны на завочнай форме навучання.



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

І ўсё ж асноўная колькасць ахвотных атрымаць вышэйшую адукацыю прайшла свой выпрабавальны шлях і цяпер чакае пачатку не толькі новага навучальнага года, але і новай вяхі ў жыцці. Таму цяпер — самы час расказаць пра тое, хто яны, новае пакаленне студэнтаў, якая іх колькасць, і пра асаблівасці сёлетняй уступнай кампаніі.

СТАР. 6-7

**Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby.**

**Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!**

ISSN 1990 — 763X

# «ТРЭБА КІРАВАЦЬ РАЁНАМ, КАНКРЭТНА ПАКАЗВАЮЧЫ ВЫНІК»

## У кадравы дзень — асаблівая ўвага мясцовай уладзе

Чацвер у Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі — кадравы дзень. Кіраўнік дзяржавы ўзгадніў новых кіраўнікоў мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, зрабіў яшчэ шэраг важных кадравых прызначэнняў.

Але асаблівая ўвага была аддадзена менавіта мясцовай вертыкалі. Ды і фармат кадравага дня быў не зусім звычайны: Прэзідэнт не толькі даваў назначэнцам даручэнні і парады, але і актыўна цікавіўся сітуацыяй на месцах.

### БРЭСЦКАЯ ВОБЛАСЦЬ. РАЗВІВАЦЬ ПАТЭНЦЫЯЛ

**Мікалай БОРТНІК, дырэктар ААТ «Тышкавічы-Агра», прызначаны старшынёй Іванаўскага райвыканкама.** Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся, ці добра новы кіраўнік ведае раён. Спытаў і пра сітуацыю ў «Тышкавічы-Агра», удакладніў, колькі ў прадпрыемства зямель, якая колькасць кароў, вядома, пацікавіўся сітуацыяй з падзяжом жывёлы. Мікалай Бортнік расказаў, што прадпрыемства робіць стаўку на малочную вытворчасць, ёсць невялікі працэнт бычкоў на мясны адкорм. І запэўніў, што Іванаўскі раён, які цяпер ён узначальвае, ведае добра.

**Ужо былы старшыня Брэсцкага райвыканкама Уладзімір СЯНЧУК цяпер узначальвае Камянецкі раён.** «Чым тлумачыцца такая перастаноўка? Заўсёды ў нас лічылася, што сталічны або абласны райвыканкам — гэта ўзровень крыху вышэйшы, там працаваць прэстыжней. А вы вырашылі ў Камянецкі перайсці», — пацікавіўся кіраўнік дзяржавы. Уладзімір Сянчук патлумачыў, што Брэсцкім райвыканкамам ён кіруе ўжо восьмы год, але гатовы выкарыстоўваць свой вопыт і ў развіцці раёна, які ён узначаліў цяпер, яго эканомікі і сельгаспрадпрыемстваў. «Я так разумею, губернатар хоча выкарыстаць вас для таго, каб Камянецкі раён утрымаць, падняць вышэй?» — удакладніў Аляксандр Лукашэнка. «Для таго каб развіць патэнцыял», — пацвердзіў Уладзімір Сянчук і адзначыў, што аграпрамысловы комплекс раёна даволі развіты.

**Былы кіраўнік Камянеччыны Віталь КУЛАК узгоднены на пасаду намесніка міністра сельскай гаспадаркі і харчавання.** Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што гэта паказальна. «Эканамічна моцны раён. Ёсць буйныя прадпрыемствы. На сёння, напрыклад, «Белавежскі», «Відамлянскае», — патлумачыў Уладзімір Сянчук.

Усяго ў Камянецкім раёне дзевяць гаспадарак, і новы старшыня райвыканкама адзначыў, што добра іх ведае, паколькі пачынаў сваю працоўную дзейнасць у размешчаным тут сельгаспрадпрыемстве «Усход», адным з наймацнейшых у краіне.

«Гэта значыць, вы ідзяце свядома туды», — удакладніў Прэзідэнт. «Так, паступіла прапанова і пагадзіўся», — адказаў Уладзімір Сянчук. Кіраўнік дзяржавы яму за гэта падзякаваў.

**Брэсцкі райвыканкам узначаліў Рыгор ПАНАСЮК, які раней працаваў першым намеснікам старшыні Жабінкаўскага райвыканкама — начальнікам упраўлення па сельскай гаспадарцы і харчаванні.**



**«Мужыкі, глядзіце, каб усё было справядліва з людзьмі. Паглядзіце, з кім вы будзеце працаваць. Час вельмі спрасаваны. Часу на тое, каб разгойдвацца, няма».**

### ВІЦЕБСКАЯ ВОБЛАСЦЬ. ПРОСТЫХ РАЁНАЎ НЯМА

Новыя кіраўнікі з'явіліся і ў паўночным рэгіёне. **Пётр БЯЛУСЬ узначаліў Глыбоцкі раён, раней працаваў намеснікам старшыні Браслаўскага райвыканкама, адказваў за сферу ЖКГ і будаўніцтва.** «Пётр Казіміравіч, што трэба зрабіць у Віцебскай вобласці, каб мы яе ў шэрагу неперспектыўных, дрэнных, нядобрых не называлі, і як губернатара ўсе «б'юць і б'юць», каб не білі? Што там рабіць?» — спытаў Прэзідэнт.

Пётр Бялусь самым адчувальным пытаннем назваў забеспячэнне людзьмі на месцах. «Трэба займацца кадравай палітыкай узмоцнена і даваць магчымасць маладым, перспектыўным. Адшукваць гэтых людзей і даваць ім магчымасць рэалізоўваць сябе», — адказаў старшыня Глыбоцкага райвыканкама, удакладніўшы, што перш за ўсё мае на ўвазе кіраўнікоў і спецыялістаў сельгаспрадпрыемстваў. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што здараюцца выпадкі, калі кадры ёсць, а сумленнай працы ад іх няма.

**Былы старшыня Сенненскага райвыканкама Алег МАКАРЭВІЧ узначаліў Дубровенскі раён.** Назначэнец адзначыў, што ў стратэгіі Віцебскай вобласці ў цэлым раёну, якім яму даручана кіраваць, адводзіцца даволі сур'ёзная місія. «З улікам таго, што ён кардынальна адрозніваецца ад шэрагу раёнаў Віцебскай вобласці ў частцы працэнта ўрадлівасці глеб, контурнасці палёў. Ён у тройцы Орша — Талачын — Дуброўна па атрыманні прадукцыі раслінаводства — гэта флагманскія раёны, на якія вобласць робіць стаўку», — распавёў Алег Макарэвіч, прызнаўшы, што маюцца пэўныя праблемы. Але, па словах новага старшыні Дубровенскага райвыканкама, яны бачныя і з яго вопытам могуць быць вырашаны.



Прэзідэнт пацікавіўся ў Алега Макарэвіча і сітуацыяй у Сенненскім раёне. «Асноўны ўхіл вытворчасці прадукцыі жывёлагадоўлі — на малако. Спецыялізаваных прадпрыемстваў, якія займаюцца адкормам, няма. На сёння вырашаецца пытанне будаўніцтва комплексу па адкорме буйной рагатай жывёлы на прадпрыемстве «Дружбінец», — распавёў былы кіраўнік Сенненскага райвыканкама. Асноўная спецыялізацыя гэтага прадпрыемства — малочная вытворчасць, завяршаецца будаўніцтва малочнатаварнага комплексу.

«Гэта значыць, у вас з падзяжом парадак і не трэба на спецыялізаваны адкормачны пункт або комплекс звазіць цялят на дагадоўванне і адкорм?» — удакладніў Прэзідэнт. Алег Макарэвіч адказаў, што ў Сенненскім раёне сёлета ўзровень падзяжу жывёлы знізіўся ў параўнанні з мінулым годам. І няма праблем, калі трэба кудысьці на адкорм адвезці бычкоў.

Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся, колькі гаспадарак у Дубровенскім раёне. «Сельскагаспадарчых прадпрыемстваў восем. І плюс Дубровенскі льнозавод — гэта флагман рэгіёна», — адказаў Алег Макарэвіч. Прэзідэнт пацікавіўся ўборкай ільну ў рэгіёне. Новы кіраўнік распавёў, што гэта работа ўжо пачатая, цэрабленне ідзе няздрэннымі тэмпамі. Па асобных палях ёсць праблемы з пераўвільгатненнем, але з кожным днём сітуацыя нармалізуецца. Што датычыцца ўборкі збожжавых, то ўсё пад кантролем.

Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся і меркаваннем новага старшыні Дубровенскага райвыканкама аб тым, чаго не хапае ў Віцебскай вобласці. Алег Макарэвіч пагадзіўся з калегам і таксама назваў праблемы з кадрамі, выканальніцкую дысцыпліну, а таксама адзначыў складанасці з матэрыяльна-тэхнічнай базай, якая не ў лепшы бок адрозніваецца ад перадавых абласцей.

**«Вы, напэўна, маеце актыўныя асноўныя сродкі: трактары, аўтамабілі, камбайны і гэтак далей. Ці дастаткова ў вас спецыялістаў, каб эксплуатаваць**

**сённяшнюю тэхніку? Яна досыць складаная. Вось уявіце: мы заўтра перададзім вам патрэбную колькасць камбайнаў, дапаможам (хоць я не кажу, што так будзе, мы ўжо і так шмат дапамагаем Віцебскай вобласці), трактары сучасныя і гэтак далей. Скажыце шчыра, вы ж назіраеце за кадрамі: яны змогуць эксплуатаваць як сваё, як роднае?» — спытаў Прэзідэнт наконт апошняй заўвагі.**

Алег Макарэвіч прызнаў, што складана ў поўнай меры забяспечыць кадрамі энерганасычаную эфектыўную тэхніку. Але пытанні гэтыя вырашаюцца, у тым ліку і з дапамогай прыцягнення спецыялістаў з прамысловых прадпрыемстваў. Напрыклад, сёлета для ўборкі ўраджаю ў Сенненскім раёне ў якасці камбайнераў запрасілі шэсць супрацоўнікаў іншых прадпрыемстваў.

Аляксандр Лукашэнка настойвае на тым, што кіраўнікі гаспадарак (нават і раённыя) павінны канкрэтна ведаць такіх прафесіяналаў, дзе яны працуюць, каб потым прыцягнуць да сябе механізатарамі. «Асабліва ў востры перыяд. Ну, гэта ўборка. Пасеяць вы і сваімі сіламі пасееце. А вось уборка — вельмі шмат работ. Трэба прыцягваць, — заявіў беларускі лідар. — Як вы глядзіце на тое, каб з імі загадзя заключыць дагаворы, бачыць іх як сваіх людзей? Дзесьці, можа быць, падтрымаць і маральна, і матэрыяльна?»

Алег Макарэвіч адказаў, што адпаведная работа праводзіцца. Ведаюць прозвішчы спецыялістаў, якіх можна запрасіць на ўборачную кампанію. «Менавіта так трэба і рабіць. Надалей трэба так рабіць. І такіх людзей трэба вельмі моцна падтрымліваць. Яны заняты на іншай працы, на іншым прадпрыемстве, але, тым не менш, пагадзіліся прыйсці і дапамагчы», — патрабуе Прэзідэнт.

Ён расказаў, што са свайго вопыту работы кіраўніком сельгаспрадпрыемства памятае аднаго чалавека, які дапамагаў на ўборцы. Камбайны тады былі зусім не такія, як цяпер, але, тым не менш, згаданы працаўнік не адзін год быў першым у гаспадарцы па ўборцы. «Мы дакладна разумелі, што гэта чалавек наш і яго страціць нельга. І я яго ўсяляк падтрымліваў. Таму трэба загадзя з імі дамаўляцца. І, можа, не толькі камбайнерамі, хоць камбайнеры — гэта перш за ўсё», — рэзюмаваў кіраўнік дзяржавы.

**Сенненскі райвыканкам узначаліў Аляксандр КЛЯЧЫН, былы намеснік кіраўніка адміністрацыі Чыгуначнага раёна Віцебска, які адказваў там за ЖКГ і будаўніцтва.** Сенненскі раён — родны для яго, таму без праблем вяртаецца туды з абласнога цэнтра. «Я заўсёды вітаю людзей, якія ідуць на радзіму, каб нешта зрабіць, — заўважыў кіраўнік дзяржавы. — Я вітаю ваша імкненне, асабліва ў Сенненскі раён. Гэты раён такі няпросты».

**Чашніцкі райвыканкам узначаліў Дзмітрый СТАНКЕВІЧ, былы намеснік старшыні Смаргонскага райвыканкама, які курыраваў ЖКГ і будаўніцтва.** «Дзякуй, што вы пагадзіліся на гэты раён. Раён прыгожы, добры, але няпросты. У Віцебскай вобласці ў нас простых раёнаў практычна няма», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка.

## ГРОДНА. ПАДТРЫМЛІВАЦЬ ПАРАДАК

**Намеснік старшыні Гродзенскага гарвыканкама Зоя КУЛЕША ўзначаліла адміністрацыю Кастрычніцкага раёна Гродна.** Прэзідэнт



пацікавіўся, чым было выклікана такое рашэнне. «Я маю вопыт, маю жаданне далей развівацца. Раён няпросты. Ён самы вялікі ў краіне. Яго аснова — прамысловы комплекс, усе горадаўтваральныя прадпрыемствы. Гэта вельмі адказны і вельмі няпросты раён. Гэта раён і з вельмі сур'ёзнай сацыяльнай сферай», — распавяла новы кіраўнік і адзначыла, што Гродна актыўна развіваецца, напярэдзе сур'ёзныя мерапрыемствы, напрыклад 15-ы Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур. «За гэта дзякуй. Фестываль у вас класны. Добра вы яго падтрымліваеце, і для Гродна гэта вельмі важна», — заўважыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што Гродна — адзін з яго любімых гарадоў. «Горад-прыгажун. Галоўнае — парадак заўсёды быў і ёсць», — падзяліўся ён. І паставіў Зоі Кулешы задачу яго падтрымліваць. І глядзець за індустрыяй. «Каб вы не саромеліся ўмешвацца ў работу прадпрыемстваў, якія, здавалася б, рэспубліканскай формы ўласнасці. Такіх прадпрыемстваў, якія не вашы, там няма. Усоды вашы прадпрыемствы», — арыентуе беларускі лідар.

## «У ВАС ПАВІННА БЫЦЬ ПЕРСАНАЛЬНАЯ НАЙГОРШАЯ ГАСПАДАРКА Ў РАЁНЕ»

«Мужыкі, глядзіце, каб усё было справядліва з людзьмі. Пaглядзіце, з кім вы будзеце працаваць. Час вельмі спрасаваны. Часу на тое, каб разгойдвацца, няма», — даў наказ новым мясцовым кіраўнікам Прэзідэнт.

Паколькі амаль усе з іх аграрыі, кіраўнік дзяржавы паставіў актуальныя задачы. Самая важная, вядома, — уборачная кампанія.

**«Уборку трэба, асабліва ў Віцебскай вобласці, працягваць. Я не скажу заканчваць — трэба ўборку працягваць. Вы падышлі толькі да паловы ўборачных работ», — адзначыў беларускі лідар.**

Ён звярнуў увагу, што надвор'е няпростае, бывала, і залівала дажджамі. Але цяпер, пакуль стаіць добрае надвор'е, трэба інтэнсіўна ўбіраць хлеб. «Трэба паскарацца, ні ў якім разе нельга расслабляцца», — арыентуе кіраўнік дзяржавы.

Што датычыцца жывёлагадоўлі, то тут Прэзідэнт назваў галоўнай стаўку на малако і адкорм буйной рагатай жывёлы. Ён параіў вельмі выбарачна падыходзіць да рашэнняў аб будаўніцтве птушкафабрык. Вядома, такой прадукцыі дастаткова, а на птушкафабрыках трэба зерне, якое не так проста атрымаць. «Пад любую жывёлагадоўчую вытворчасць патрэбен адпаведны севазварот. Гэта датычыцца Віцебскай вобласці на 100 %. Што датычыцца брэсцкіх раёнаў, пра якія мы сёння гаворым, гэта магутныя, моцныя раёны. Хоць, калі казаць пра Камянецкі раён, ён адпавядае назве — камянёў там гэтых хапае. Але, тым не менш, гэта раён добры», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Дарэчы, уборку на Камянеччыне ўжо завяршылі, ураджайнасць збожжавых склала 45 ц/га — больш, чым летась. Прэзідэнт таксама адзначыў, што Віцебскую вобласць яшчэ чакае сур'ёзная размова на адпаведнай нарадзе.

Аляксандр Лукашэнка параіў новым кіраўнікам працаваць акуратна, не сячы з-за пляча, справядліва ставіцца да кадраў і дапамагаць.

**«І запомніце, што ў вас павінна быць персанальная найгоршая гаспадарка ў раёне, за якую вы адказваеце, — заявіў кіраўнік дзяржавы. — Як мяне інфармуе Дзмітрый Мікалаевіч (кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрый Крутой. — «Зв.»), мы цяпер націск пэўны робім у гэтым кірунку. Кіраўнікі раёна сябе не вельмі добра адчуваюць, калі за імі замацоўваеш асобна найгоршую гаспадарку. Мужыкі, так справа не пойдзе. Трэба кіраваць раёнам, канкрэтна паказваючы вынік. Таму вызначайцеся, якую гаспадарку пад крыло возьмеце і дапамажаце, пачынаючы з навядзення парадку, севазвароту, дысцыпліны і заканчваючы паказчыкамі эфектыўнасці».**

Аляксандр Лукашэнка пажадаў поспеху кіраўнікам, якія знаходзяцца на пярэднім краі.

* * *

**Адбыліся новыя назначэнні і ў кіраўніцтве рэспубліканскіх органаў.**

**Алена БОГДАН** — першы намеснік міністра аховы здароўя.

**Іван ВЕЖНАВЕЦ** — першы намеснік міністра эканомікі.

Кандыдатура **Антона АЛЯКСЕЕВА** ўзгоднена на пасаду намесніка міністра сувязі і інфарматызацыі.

А кандыдатура **Аляксандра ЯКАЎЧЫЦА** — на пасаду намесніка міністра сельскай гаспадаркі і харчавання.

У гэты кадравы чацвер змянілася і структура дыпламатычнага корпуса.

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Аб'яднаных Арабскіх Эміратах і па сумяшчальніцтве ў Каралеўстве Бахрэйн і Дзяржаве Кувейт **Ігар БЕЛЫ** разам са згаданым будзе прадстаўляць інтарэсы краіны таксама ў Каралеўстве Саудаўская Аравія.

**Дзмітрый ДЗЕРАВІНСКІ**, пасол Беларусі ў Венесуэле, па сумяшчальніцтве прызначаны Надзвычайным і Паўнамоцным Пасло м у Балівіі.

**Яўген САБАЛЕЎСКІ** — пасол Беларусі ў Егіпце і па сумяшчальніцтве ў Алжыры, Амане цяпер прадстаўляе інтарэсы Беларусі і ў Судане.

**Віталь ГАРМАШУК** узгоднены на пасаду дырэктара Дэпартамента дзяржаўных знакаў Міністэрства фінансаў.

Кандыдатура **Сняжаны Цітовай** узгоднена на пасаду кіраўніка спраў Віцебскага аблвыканкама.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота БелТА.**

## Даслоўна

### Не памыляецца той, хто нічога не робіць



Свaімі планамі прызначэнцы падзяліліся не толькі з Прэзідэнтам, але і пасля з журналістамі. **Уладзімір СЯНЧУК** расказаў, што Камянецкі раён яму знаёмы. «Я ведаю, што неабходна зрабіць для таго, каб ён далей развіваўся. Кіраўнік дзяржавы шмат увагі ўдзяліў рабоце з кадрамі, справядліваму стаўленню да людзей, якія працуюць на зямлі. Акцэнт зроблены на развіццё аграрнага сектара. У раслінаводстве — выкананне севазвароту, у жывёлагадоўлі — вырошчванне буйной рагатай жывёлы. Асноўнае для нас — атрыманне малака, паколькі гэта самая рэнтабельная сельскагаспадарчая прадукцыя. І, канешне, акцэнт на захаванне пагалоўя жывёлы», — адзначыў Уладзімір Сянчук. Ён расказаў, што як кіраўнік дае магчымасць кожнаму супрацоўніку прымаць рашэнні і несці адказнасць за вынікі. Канешне, з правам на памылку. «Не памыляецца той, хто нічога не робіць. І я стараюся максімальна падтрымліваць ініцыятыву», — падзяліўся Уладзімір Сянчук.



**Алег МАКАРЭВІЧ, старшыня Дубровенскага райвыканкама**, расказаў, што ўсе заўвагі і пажаданні Прэзідэнта прыме да ўвагі. «Наша задача — аператыўна ўнікнуць у сітуацыю ў раёне і арганізаваць работу так, каб атрымаць станоўчыя вынікі. Ёсць праблемы. Раён прыгранічны, і ёсць праблемы з міграцыяй працаздольнага насельніцтва, адтокам кадраў. На гэтыя моманты буду звяртаць пільную ўвагу», — адзначыў ён.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, 40, пом. 46, оф. 2, УНП 191021390 |
| Продавец | ОАО «Паритетбанк», г. Минск, ул. Киселева, 61а. УНП 100233809 |
| Оператор ЭТП | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, 40, пом. 46, оф. 1. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов**

**Грузопассажирский фургон VOLKSWAGEN CRAFTER 35, AE 9548-7,** 2008 г. в.

Местоположение: г. Минск, ул. Киселева, 61А

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 31 518,00 бел. руб.**
(снижена на 15 %)
Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** в размере 100 % стоимости имущества не позднее **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания договора купли-продажи

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by.
Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, которое является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы».
Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить **вознаграждение организатору торгов по лотам 6 %** от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 08.07.2025

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 01.09.2025 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.
**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 29.08.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

**Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**

| Предметы аукциона | Начальная цена, руб. | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|
| **Лот № 1:** изолированное помещение с инвентарным номером 121/D-3515 (наименование: квартира; назначение: Квартира) площадью 60,2 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Дрогичинский р-н, Дрогичинский с/с, д. Нагорье, ул. Железнодорожная, 65-3 | 15 061,13 | 1 506,11 |
| **Лот № 2:** изолированное помещение с инвентарным номером 121/D-3516 (наименование: квартира; назначение: Квартира) площадью 60,7 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Дрогичинский р-н, Дрогичинский с/с, д. Нагорье, ул. Железнодорожная, 65-2 | 15 186,23 | 1 518,62 |

**Продавец:** РСУП «Брестплемпредприятие», г. Брест, ул. Карбышева, 35, тел. 80162530948. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления.
**Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901.
**Условия продажи:** возможно предоставление рассрочки оплаты стоимости имущества в случае подачи заявления.
**Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона.
**Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи.
**Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона.
**Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона.
**Шаг аукциона:** 10 % от предыдущей названной цены

**Аукцион состоится 16 сентября 2025 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона **www.ocenkabrest.by,** на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь (https://au.nca.by/auction/32493), также можно узнать по телефонам: **8 (0162) 40-87-01, 40-87-41**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329, в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 15 сентября 2025 г. до 17.00**

АКТУАЛЬНА

# ПЛЮС У КІШЭНІ

## У Беларусі з 1 верасня вырастуць пенсіі і заробкі бюджэтнікаў

Так, пераразлік працоўных пенсій і іх павышэнне адбудзецца ў сярэднім на 5 %. Гэта прадугледжана ўказам, які падпісаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

Тут патлумачылі, што на выплату пенсій у верасні гэтага года будзе накіравана каля 2,2 мільярда рублёў, з якіх 107 мільёнаў — дадатковыя выдаткі ў сувязі з павышэннем пенсій згодна з указам.

З 1 верасня павялічыцца заробак бюджэтнікаў, бо памер базавай стаўкі для аплаты працы ў бюджэтнай сферы складзе 273 рублі. Адпаведную пастанову падпісаў Прэм'ер-міністр Аляксандр Турчын, паведамілі ў прэс-службе ўрада. Дарэчы, гэта рашэнне ўплывае на працяг паэтапнага росту зарплаты бюджэтнікаў.

У Мінпрацы і сацабароны нагадалі, што гэта ўжо другое павышэнне базавай стаўкі за год. З 1 студзеня яна была павялічана на 6,7 % — з 253 да 270 рублёў. У параўнанні з мінулым годам сярэднегадавы памер базавай стаўкі павялічыцца на 8 %.

Акрамя таго, на працягу года прымаюцца меры па павелічэнні памераў стымуляцыйных выплат асобным катэгорыям работнікаў усіх галін сацыяльнай сферы, дадалі ў ведамстве. У прыватнасці, у адукацыі — з 1 студзеня (настаўнікам, выхавальнікам, памочнікам выхавальніка, выкладчыкам, майстрам вытворчага навучання, прафесарска-выкладчыцкаму складу, педагогам-псіхолагам, педагогам сацыяльным) і з 1 мая (настаўнікам-дэфектолагам, выхавальнікам, работнікам бібліятэк ва ўстановах адукацыі); у культуры і сферы аказання сацыяльных паслуг — з 1 студзеня (усім работнікам); у сферы фізічнай культуры і спорту — з 7 мая (усім работнікам); у галіне аховы здароўя — з 1 студзеня (урачам-спецыялістам), з 1 сакавіка, 1 верасня і 1 снежня (сярэдняму медыцынскаму персаналу).

Як адзначылі ў профільным міністэрстве, павышэнне базавай стаўкі з верасня закране больш за 800 тысяч работнікаў бюджэтнай сферы.

У выніку прынятых мер сярэднямесячная заработная плата работнікаў бюджэтных арганізацый за 6 месяцаў бягучага года павялічылася ў параўнанні з адпаведным перыядам 2024 года на 18,8 % і склала 2 010,8 рубля, і рэальная заработная плата ўзрасла з тэмпам 111,8%.

У цэлым на аплату працы работнікаў бюджэтнай сферы ў 2025 годзе плануецца накіраваць каля 20,7 мільярда рублёў, у тым ліку на дадатковыя стымуляцыйныя выплаты асобным катэгорыям работнікаў — каля 2,69 мільярда рублёў, адзначылі ў Мінпрацы.

ЕЎРАЗІЙСКАЯ ІНТЭГРАЦЫЯ

# ЗАДАЧЫ

## Актуальны парадак дня на пасяджэнні

Ад агульнага рынку газу да кліматычнага парадку дня. У Кыргызстане прайшло пасяджэнне Еўразійскага эканамічнага міжурадсавета ў вузкім складзе пад старшынствам Прэм'ер-міністра Беларусі Аляксандра Турчына. Падрабязнасці — у нашым матэрыяле.

Кіраўнік беларускага ўрада знаходзіцца з двухдзённым рабочым візітам у Кыргызстане. У першы дзень візіту пад яго старшынствам прайшло пасяджэнне ЕМУС у вузкім складзе, у другі запланаваны сустрэча з Прэзідэнтам Кыргызстана Садырам Жапаравым і пасяджэнне міжурадсавета ў пашыраным складзе з падпісаннем выніковых дакументаў.

Нагадаем, што сёлета наша краіна старшынствуе ў органах Еўразійскага эканамічнага саюза. Цяперашняе пасяджэнне кіраўнікоў урадаў «пяцёркі» было вырашана правесці ў невялікім мястэчку Чалпон-Ата, што знаходзіцца на ўзбярэжжы легендарнага возера Ісык-Куль. У дзяржаўнай рэзідэнцыі Кангрэс-хол удзельнікі ЕМУС вырашалі актуальныя пытанні Еўразійскага эканамічнага парадку.

Як распавяла па выніках пасяджэння ЕМУС у вузкім складзе **намеснік Прэм'ер-міністр Наталля ПЯТКЕВІЧ**, работа над дакументамі ажыццяўляецца спачатку на экспертным узроўні, потым на ўзроўні Савета ЕЭК. Калі кансэнсусу не ўдаецца дасягнуць на папярэдніх стадыях — пытанне выносіцца на вышэйшы ўзровень (альбо кіраўнікоў урадаў, альбо кіраўнікоў дзяржаў).

Як распавяла віцэ-прэм'ер, на пасяджэнні ў вузкім складзе разглядалі чатыры пытанні, дыскусіі па адным з якіх вяліся каля года, а кампраміс дасягнуты літаральна на працягу апошняй гадзіны пасяджэння. Яна падкрэсліла, што, ствараючы адзіную прастору, інтэграцыйнае аб'яднанне, бакі кіруюцца галоўным прынцыпам — пошукам кампрамісаў.

— Не заўсёды гэта магчыма, не заўсёды да гэтага ёсць гатоўнасць і жаданне. Зразумела, ёсць і пэўныя сілы ўнутры краіны. Сплесці ў клубок гэты комплекс інтарэсаў заўсёды вельмі складана, — пракаментавала Наталля Пяткевіч.

Яна дадала, што падчас цяперашняга пасяджэння абмяркоўваліся досыць сур'ёзныя і складаныя пытанні:

— Гэта пытанні мытнага рэгулявання, таму што ўсе праблемы, якія ў свеце ўзнікаюць з мытнымі пошлінамі, кантрафактам, натуральна, адбіваюцца на нашых дзяржавах. Таму вельмі важна ўсім разам абараніць сваю мытную

# ЗАКОНЫ, ПАТРЭБНЫЯ

## Каб яны такімі былі, законапраектам патрэбна

Супрацоўніцтва Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававой інфармацыі з Палатай прадстаўнікоў пачынаецца яшчэ на стадыі падрыхтоўкі і абмеркавання прапаноў у план падрыхтоўкі праектаў заканадаўчых актаў на чарговы год. У працэсе падрыхтоўкі законапраектаў сумесная работа носіць больш канкрэтны і прадметны характар.



На кожнай стадыі разгляду ўнесеных у Палату прадстаўнікоў законапраектаў НЦЗПІ забяспечвае правядзенне іх абавязковай юрыдычнай экспертызы. Акрамя таго, спецыялісты цэнтра ўдзельнічаюць у дапрацоўцы праектаў законаў, абмеркаванні выказаных заўваг і прапаноў, у выніку чаго выпрацоўваюць новыя прававыя прадпісанні і іх рэдакцыі. Сярод задач Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававой інфармацыі — афіцыйнае апублікаванне прававых актаў і распаўсюджванне прававой інфармацыі, правядзенне навуковых даследаванняў у галіне права і падрыхтоўка навуковых супрацоўнікаў вышэйшай кваліфікацыі.

Гаворачы аб унёску Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававой інфармацыі ў заканатворчы працэс, **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА** на сустрэчы з калектывам цэнтра звярнуў увагу на тое, што супрацоўнікі ўстановы ажыццяўляюць кантроль за рэалізацыяй урадам і іншымі органамі заключных палажэнняў прынятых законаў. «Яшчэ адна важная ў тым ліку і для парламентарыяў функцыя — правядзенне цэнтрам прававога маніторынгу, гэта значыць аналізу і ацэнкі на аснове правапрымянення эфектыўнасці і актуальнасці норм дзеючых законаў, — дадаў Ігар Сергеенка. — Дарэчы, гэта задача з'яўляецца адной з асноўных перад дэпутатамі ў рабоце ў акругах, зносінах з выбаршчыкамі, сустрэчах з працоўнымі калектывамі».

Значнай крыніцай заканатворчасці для парламентарыяў сталі навуковыя даследаванні, якія праводзіцца НЦЗПІ. Напрыклад, даследаванне грамадзянска-прававой прыроды лічбавых правоў і лічбавай маёмасці з

# ДЛЯ «ПЯЦЁРКІ»

## Еўразійскага эканамічнага саюза абмеркавалі міжурадавага савета




Фота БелТА.

прастору. Гэта патрабуе адаптацыі заканадаўстваў і мытных практык і пэўнай лічбавізацыі (працэсы складаныя ў тэхналагічным плане, не менш складаныя яны і ў прававым рэгуляванні).

Наталля Пяткевіч таксама паведаміла, што бакі завяршаюць выкананне Стратэгіі-2025:

— У нас ёсць жаданне паспрабаваць прыйсці да поўнага выканання Стратэгіі. Для гэтага цяпер ва ўзмоцненым рэжыме працуюць усе структуры на ўсіх узроўнях, каб паспрабаваць знайсці кампрамісы.

Віцэ-прэм'ер дадала, што бакі таксама разгледзелі дастаткова складанае пытанне па абароне нацыянальных вытворцаў краін — удзельніц ЕАЭС:

— Ёсць пэўная розніца і ў правым рэгуляванні, ёсць некаторыя адрозненні ва ўмовах знешнеэканамічнай дзейнасці. І кіраўнікі нашых урадаў спрабавалі знайсці кампраміс. Вельмі прыемна, што ёсць узаемны рух насустрач. І хоць пакуль рашэнне не прынята, але ўзята пауза на месяц. І, прынамсі, усе бакі поўныя гатоўнасці ў Мінску гэтае пытанне нарэшце завяршыць.

Дарэчы, у пашыраным складзе бакі абмяркуюць пытанні не менш акуальныя. Адзначым, што гэтым разам на парадак дня ЕМУС былі вынесены два дзясяткі пытанняў, сярод якіх зацвярджэнне праграмы развіцця біржавых таргоў на агульным біржавым (арганізаваным) рынку тавараў у рамках ЕАЭС; гадавой справаздачы ЕЭК аб стане канкурэнцыі на трансгранічных рынках і мерах, якія прымаюцца па спыненні парушэнняў агульных правілаў канкурэнцыі на іх за 2024 год; унясенне змены ў план мерапрыемстваў па рэалізацыі асноўных напрамкаў і этапаў рэалізацыі скаардынаванай (узгодненай) транспартнай палітыкі дзяржаў — членаў ЕАЭС на 2024 — 2026 гады.

Таксама ўдзельнікі азнаёміліся з дакладамі аб ходзе фарміравання ў 2024 годзе агульных рынкаў нафты і нафтапрадуктаў ЕАЭС, агульнага рынку газу «пяцёркі», з канцэпцыямі развіцця агульнага рынку лекаў і медвырабаў у ЕАЭС. Заслухалі ход рэалізацыі ў мінулым годзе плана першачарговых мерапрыемстваў па лічбавізацыі грузавых чыгуначных перавозак у ЕАЭС і мерапрыемстваў, прадугледжаных раздзелам «Лічбавізацыя транспартных калідораў» плана па развіцці гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва паміж ЕАЭС і КНР.

У полі зроку ўдзельнікаў таксама выкананне даручэння ЕМУС аб рэалізацыі падыходаў па рэгуляванні пытанняў кліматычнага парадку дня і даклад аб мэтазгоднасці збліжэння кваліфікацыйных патрабаванняў па найбольш запатрабаваных прафесіях на рынку працы ЕАЭС і парадку пацвярджэння прафесійных кваліфікацый.

# І ЗРАЗУМЕЛЫЯ ЛЮДЗЯМ

## прафесійная юрыдычная экспертыза і прававы маніторынг

выпрацоўкай прапаноў па замацаванні адпаведных норм у Грамадзянскім кодэксе стымулявала правядзенне ў Палаце прадстаўнікоў у канцы мінулага года парламенцкіх слуханняў на тэму «Развіццё лічбавага права ў Рэспубліцы Беларусь».

Сур'ёзнай дапамогай у рабоце заканадаўцаў, па словах Старшыні Палаты прадстаўнікоў, з'яўляецца і забеспячэнне цэнтрам публічнага абмеркавання праектаў законаў, іншых нарматыўных прававых актаў. Ужо стаў традыцыйным удзел кіраўніцтва, спецыялістаў цэнтра ў правядзенні навучальных семінараў па пытаннях нарматворчасці, выкарыстання прававых баз і інфармацыйных рэсурсаў.

Ігар Сергяенка асобна спыніўся на Законе «Аб нарматыўных прававых актах», які ў кулуарах называюць «канстытуцыяй нарматворцы». У цяперашні час спецыялісты НЦЗПІ рыхтуюць праект, які прадугледжвае карэкціроўку гэтага закона. Як звярнуў увагу Старшыня Палаты прадстаўнікоў, ён змяшчае шэраг навацый, якія заслугоўваюць увагі. Сярод іх — інвентарызацыя нарматыўных прававых актаў, а таксама павышэнне для мэт кантрольнай дзейнасці статусу тлумачэнняў заканадаўства, дадзеных кіраўнікамі кампетэнтных дзяржорганаў.

Спікер лічыць, што ў рамках сумеснай работы над дадзеным законапраектам трэба прапрацаваць пытанне аб мэтазгоднасці перадачы функцыі кантролю рэалізацыі заключэння палажэнняў прынятых законаў ад цэнтра — парламенту. Па яго словах, гэта дасць магчымасць Нацыянальнаму сходу больш эфектыўна рэалізоўваць задачы, якія стаяць перад ім у сферы заканатворчасці, і палепшыць зваротную сувязь паміж заканадаўчым і выканаўчымі органамі ўлады падчас прыняцця законаў.

16 верасня пачне работу трэцяя сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу восьмага склікання.

Ігар Сергяенка адзначыў, што задачы, якія стаяць перад парламентарыямі, на наступны перыяд дакладна вызначаны зацверджанымі кіраўніком дзяржавы Канцэпцыяй прававой палітыкі і Дырэктывай ад 2 красавіка 2025 года № 11 «Аб удасканаленні функцыянавання сістэмы органаў улады і кіравання, узмацненні выканальніцкай дысцыпліны».

«Таксама неабходна ўзмацніць экспертную прапрацоўку прававых ініцыятыў, выключыць замацаванне ў законах складаных, неадназначных прававых норм, лішак прававога рэгулявання і мноства актаў заканадаўства па адных і тых жа пытаннях, — звярнуў увагу спікер. — Канчатковая мэта нашай работы — гэта якаснае, эфектыўнае і, самае галоўнае, зразумелае грамадству заканадаўства, якое адпавядае актуальным запытам насельніцтва, дзяржавы».

**Веранiка КАНЮТА.**
**Фота прэс-службы Палаты прадстаўнікоў.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**ОАО «Н Холдинг»**
**проводит открытый аукцион по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности**
**ОАО «МПОВТ»**

**Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Н Холдинг» по организации и проведению аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **ЛОТ № 1** | Капитальное строение с инв. № 600/С-182236, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/13, вблизи аг. Колодищи. Площадь: 695,6 кв. м. Наименование: Производственно-складской комплекс док-склад (инв. № 39032). Назначение: Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: 13А1/м-Производственно-складской комплекс док-склад (инв. № 39032). Обременение: аренда. Капитальное строение расположено на земельном участке с кадастровым номером 623683400001000692 площадью 9,7659 га, предоставленный ОАО «МПОВТ» на праве постоянного пользования (срок действия: не установлен). На земельном участке установлены следующие ограничения (обременения): зона санитарной охраны источников артскважина № 32265/78, площадь 9,7659 га | | | | |
| **Начальная цена (стоимость) (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **385 434,00** | **Задаток, BYN** | **38 543,40** | **Шаг аукциона** | **5 %** |
| **ЛОТ № 2** | Капитальное строение с инв. № 600/С-156718, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 16. Площадь: 964,7 кв. м. Наименование: Склад для хранения химических и других материалов. Назначение: Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: Одноэтажное кирпичное здание склада для хранения химических и других материалов с четырьмя навесами 1, 2, 3, 4. Обременение: аренда. Капитальное строение с инв. № 600/С-149365, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/2, район аг. Колодищи. Площадь: 548,6 кв. м. Наименование: Склад металлоизделий с участком комплектации. Назначение: Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: Одноэтажное металлическое здание склада металлоизделий с участком комплектации. Обременение: аренда. Капитальные строения расположены на земельном участке с кадастровым номером 623683400001000692 площадью 9,7659 га, предоставленный ОАО «МПОВТ» на праве постоянного пользования (срок действия: не установлен). На земельном участке установлены следующие ограничения (обременения): зона санитарной охраны источников артскважина № 32265/78, площадь 9,7659 га | | | | |
| **Начальная цена (стоимость) (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **982 306,08** | **Задаток, BYN** | **98 230,61** | **Шаг аукциона** | **5 %** |
| **Сведения о продавце, его местонахождение и контактные телефоны** | ОАО «МПОВТ», Республика Беларусь, 220140, г. Минск, ул. Притыцкого, д. 62. Тел. +375 (17) 388 90 99. E-mail: mpovt@mpovt.by | | | | |
| **Сведения об организаторе аукциона** | ОАО «Н Холдинг» 220029, г. Минск, пр-т Машерова, 11, пом. 1. Тел. 8 029 754 63 46 (Мария) | | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | Договор купли-продажи должен быть заключен в течение **10 (десяти) рабочих дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона** | Победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, в течение 5 (пяти) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона, а также в течение 3 (трех) рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона выплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 3 % от цены продажи предмета аукциона на основании счета, выставленного организатором аукциона | | | | |
| **Условия оплаты** | Оплата задатка производится резидентами в белорусских рублях (нерезидентами в белорусских рублях или в долларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты) на следующие банковские реквизиты: р/с BY79 AKBB 3012 0000 1634 1000 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, 220005, г. Минск, пр-т Независимости, 56. Получатель – открытое акционерное общество «Н Холдинг», УНН 101059240 ОКПО 37392696. Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты объекта, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Место, дата и время приема заявлений на участие в аукционе** | Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **по 12 сентября 2025 г. включительно** в рабочие дни с 9.00 до 16.55 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35-1 | | | | |
| **Место, дата и время проведения аукциона** | Аукцион состоится **15 сентября 2025 года** по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, 35-1, зал совещаний ОАО «Н Холдинг»: по Лоту № 1 в 11.00; по Лоту № 2 в 15.00 | | | | |

Организатор аукциона после опубликования извещения о его проведении вправе в любое время без объяснения причин, но не позднее чем за 3 календарных дня до даты проведения аукциона, указанной в извещении о проведении аукциона, отказаться от проведения аукциона

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ
В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 (www.cpo.by) |
| **Продавец** | ОАО «Слуцкий мясокомбинат». 223610, Минская обл., г. Слуцк, ул. Тутаринова, д. 18. УНП 600119108 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. УНП 191 224 638 (www.ipmtorgi.by) |

**Предмет электронного аукциона**

**Легковой джип VOLKSWAGEN TOUAREG,**
VIN WVGZZZ7LZ7D026033, рег. знак 9191 ВВ-5, 2006 г. в.

Местонахождение:
Минская область, г. Слуцк, ул. Тутаринова, д. 18

**Начальная цена с НДС 20 % – 15 367,20 руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN); БИК BELBBY2X. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки». УНП 191 021 390

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов: 10 (десять)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **6 %** от цены продажи лотов в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до момента определения победителя торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 15.09.2025 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.
**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 12.09.2025 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: **www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35.**
**E-mail: auction@cpo.by**

# КАМПЕТЭНТНЫ КАМЕНТАРЫЙ

# НЕ ПРОСТА СІГНАЛ, АЛЕ ЯКАСНАЯ

## Указ Прэзідэнта «Аб будаўніцтве аб'ектаў сотавай сувязі» паскарае ўкараненне тэхналогіі 5G

Асноўныя задачы дакумента — стварэнне аператарам сотавай сувязі максімальных умоў для забеспячэння даступнасці іх паслуг і развіцця адпаведнай інфраструктуры.
Пра гэта на прэс-канферэнцыі «Аб рэалізацыі Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 301 «Аб будаўніцтве аб'ектаў сотавай сувязі» ў Нацыянальным прэс-цэнтры паведаміла прадстаўнік распрацоўшчыка прававога акта, намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення — начальнік упраўлення праектнай дзейнасці, горадабудаўніцтва і архітэктуры Міністэрства будаўніцтва і архітэктуры Рэспублікі Беларусь Ганна КУДРАВЕЦ.

«Улічваючы, што будаўніцтва аб'ектаў закранае шмат аспектаў, аж да выдзялення зямельных участкаў, гэтым указам закрануты не толькі сферы будаўніцтва, але і сферы заканадаўства, — звярнула ўвагу Ганна Кудравец. — Адным з фактараў, які патрабуе значнага часу для будаўніцтва аб'ектаў, з'яўляецца атрыманне дазвальняльнай дакументацыі. Указам выключаецца неабходнасць аператарам сотавай сувязі атрымліваць такую дакументацыю. Пры гэтым сведчанні, неабходныя для забеспячэння бяспекі аб'ектаў, якія будуюцца, аператары будуць атрымліваць самастойна».

Указ дазваляе праектаваць і будаваць адначасова з вырашэннем зямельных пытанняў, дадала прадстаўнік Мінбудархітэктуры. Для праектавання не спатрэбіцца наяўнасць акта выбару зямельных участкаў. «Гэта працэдура дастаткова доўгая, і яе выключэнне максімальна скароціць тэрміны магчымасці размяшчэння аб'ектаў», — патлумачыла спікер. Неабходнасць такога акта застанецца ў выпадку будаўніцтва на пэўных катэгорыях зямель, выкарыстанне якіх (напрыклад, прыродаахоўных і лесагаспадарчых) магчыма толькі пры ўзгадненні з кіраўніком дзяржавы.

Важнае наваўвядзенне — дазвол аператарам будавацца на зямлі, якая адведзена ўздоўж аўтадарог і чыгункі. У выніку звыклае нам «няма сувязі» ў дарозе будзе забыта, запэўніваюць распрацоўшчыкі акта.

Парадак распрацоўкі праектнай дакументацыі спрашчаецца таксама за кошт магчымасці будавацца пры наяўнасці ўзгодненага эскізнага праекта



# КОЖНЫ ПЯТЫ БЮДЖЭТНІК — КОЖНЫ ЧАЦВЁРТЫ — БУДУЧЫ ІНЖЫНЕР, А КОЖНЫ ДЗЯСЯТЫ — ПЕДАГОГ, МЕДЫК, АБО РАБОТНІК АПК

— Перш як пачаць аналізаваць папярэднія вынікі ўступнай кампаніі, я хачу падкрэсліць: яна праведзена ў поўнай адпаведнасці з задачамі, пастаўленымі кіраўніком дзяржавы па забеспячэнні роўных і празрыстых умоў для паступлення матываваных, адораных і падрыхтаваных абітурыентаў, — канстатаваў **першы намеснік міністра адукацыі Аляксандр БАХАНОВІЧ.** — Міністэрствам адукацыі сумесна з органамі дзяржкіравання, ВНУ, заказчыкамі кадраў былі створаны ўсе неабходныя ўмовы для якаснай арганізацыі прыёмнай кампаніі. Асноўны вынік прыёму ў ВНУ завяршыўся практычна стапрацэнтным выкананнем плана.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Студэнтамі, па словах першага намесніка міністра, сталі больш за 45,5 тысячы чалавек, з іх будуць вучыцца на бюджэце больш як 30,5 тысячы, на платнай аснове — каля 15 тысяч. Кожны чацвёрты з тых, хто паступіў у ВНУ Беларусі,— гэта будучы інжынер, кожны дзясяты — педагог, медык або работнік аграпрамысловага комплексу.

## У ТОПЕ ЗАПАТРАБАВАНЫХ

Аналізуючы вынікі ўступнай кампаніі, Аляксандр Бахановіч падкрэсліў, што яна прайшла досыць актыўна.

— Пра гэта сведчаць конкурсы і прахадныя балы, — сказаў ён. — Асаблівая ўвага была ўдзелена прыёму абіту-




Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Брестский филиал
РУП «Институт недвижимости и оценки»
ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ
ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Лот № 1: изолированное помещение с инвентарным номером 122/D-8489**
(наименование: **столовая;**
назначение: **помещение общественного питания),**
площадью 1647,5 кв. м, расположенное по адресу:
Брестская обл., Ивацевичский р-н, г. Ивацевичи,
ул. 40 лет Октября, 3А-1

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Начальная цена, руб. (с учетом НДС)** | **40 800,00** | **Размер задатка, руб.** | **4 080,00** |

**Продавец:** ОАО «Ивацевичиагротехсервис», 225295, Брестская обл., г. Ивацевичи, ул. 40 лет Октября, 3, тел./факс 80164592143.
**Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701.
Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления.
**Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901.
**Условия продажи:**
1. Приступить к реконструкции объекта недвижимости (лот № 1) на основании разработанной в установленном законодательством порядке проектно-сметной документации после получения в Ивацевичском райисполкоме разрешительной документации не позднее одного года с даты акта приема-передачи объекта покупки.
2. С даты приема-передачи объекта недвижимости (лот № 1) на регулярной основе выполнять работы по техническому содержанию объекта в пригодном для эксплуатации состоянии, проводить работы по благоустройству и содержанию прилегающей территории в эстетически приглядном виде.
3. Внешний вид объекта недвижимости (лот № 1) (фасады, цоколь, кровля) на постоянной основе поддерживать в состоянии, пригодном для эстетического восприятия.
4. В случае невыполнения вышеназванных условий продавец имеет право инициировать расторжение договора купли-продажи объекта недвижимости (лот № 1).
**Срок заключения договора купли-продажи:** до 20 рабочих дней со дня проведения аукциона.
**Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи.
**Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона.
**Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 02 сентября 2025 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона **www.ocenkabrest.by,** также можно узнать по телефонам: **8 (0162) 40-87-01, 40-87-41**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329, в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 01 сентября 2025 г. до 17.00**

# СУВЯЗЬ



і праектнай дакументацыі, склад якой вызначыў сам аператар сотавай сувязі. Выключаецца неабходнасць шэрага наглядаў за будаўніцтвам (аўтарскага, тэхнічнага і іншых), акрамя дзяржбуднагляду, але і апошні не спатрэбіцца, калі аб'ект не трапляе ў адпаведны пералік.

Адно з самых значных новаўвядзенняў — аператары сотавай сувязі атрымліваюць права ўстаноўкі і эксплуатацыі сродкаў электрасувязі на аб'ектах, якія будуюцца, гэта значыць, да іх прыёмкі ў эксплуатацыю. Такая практыка ўжо была выкарыстана і станоўча сябе зарэкамендавала пры будаўніцтве ў сталіцы басейна міжнароднага класа і Мінскага міжнароднага выставачнага цэнтра.

Указ удакладняе, што ўстаноўка абсталявання на аб'ектах, якія ўжо эксплуатуюцца, не адносіцца да будаўнічай дзейнасці. Пры гэтым не выключаецца неабходнасць захавання заканадаўства ў галіне культуры, калі аб'ект мае гісторыка-культурную каштоўнасць, і ў галіне паветранай прасторы, каб абсталяванне не паўплывала на бяспеку палётаў.

Дакументам таксама выключана неабходнасць правядзення ацэнкі ўздзеяння аб'ектаў сотавай сувязі на навакольнае асяроддзе. «Мы не маем ніводнага дакументальна зафіксаванага выпадку адмоўнага ўздзеяння (аб'ектаў сотавай сувязі. — **Рэд.**) на навакольнае асяроддзе, — абгрунтаваў палажэнне **начальнік упраўлення электрасувязі і рэгулявання радыёчастотнага спектра Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь Дзмітрый КОРЗУН.** — Мы выкарыстоўваем стандартныя дыяпазоны частот. Бачым усе рэкамендацыі адпаведных арганізацый, у тым ліку міжнародных. Ведаем вопыт краін як СНД, так і еўрапейскіх». Працэдура ацэнкі ўздзеяння на навакольнае асяроддзе часам затрымлівала ўвод у эксплуатацыю аб'ектаў сотавай сувязі да 8 месяцаў, заўважыў спікер.

«Пачынаючы з 2017 года мы назапасілі вялізную базу даных па праблемных кропках, якія ёсць як у гарадской, так і ў сельскай мясцовасці, дзе якасць паслуг (сотавай сувязі. — Рэд.) недастатковая», — пракаментаваў неабходнасць распрацоўкі ўказа Дзмітрый Корзун. Ён нагадаў аб даручэнні кіраўніка дзяржавы Савету Міністраў разам з выканкамамі да канца гэтага года забяспечыць высокую якасць электрасувязі ў сельскай мясцовасці і адзначыў, што сёлета амаль удвая будзе павялічана колькасць новых базавых станцый у параўнанні з мінулым годам. І гэта — толькі пачатак у справе ўкаранення ў краіне тэхналогіі 5G. Да 2034 года колькасць базавых станцый будзе каля 80 тысяч (цяпер 41 тысяча). Указ № 301 якраз дазваляе дасягнуць такой мэты, бо дае магчымасць паскорыць стварэнне неабходнай інфраструктуры.

Па ацэнках Мінсувязі, аб'екты, праектаванне і будаўніцтва якіх дагэтуль патрабавала 1,5 — 2 гады, дзякуючы ўказу будуць з'яўляцца на працягу года.

Прадстаўнік міністэрства адзначыў, што будаўніцтва аб'ектаў сотавай сувязі, асабліва ў сельскай мясцовасці, носіць, у першую чаргу, сацыяльны характар, бо гэта гарантыя своечасовага выкліку хуткай дапамогі, дзяжурных службаў і ўстойлівай сувязі з роднымі, якія знаходзяцца на адлегласці. «Мы дасягнулі пакрыцця ўсёй тэрыторыі сучаснымі тэхналогіямі, але мала ўбачыць сігнал на нашых тэлефонах — важна, каб прапускная здольнасць каналаў магла забяспечыць годную якасць паслуг камунікацыі», — рэзюмаваў Дзмітрый Корзун.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# МЭТАВІК

рыентаў па спецыяльнасцях, запатрабаваных эканомікай краіны. Гэта, перш за ўсё, кадры для аграпрамысловага комплексу, якія забяспечваюць нашу харчовую, а значыць, і нацыянальную бяспеку. У выніку на сельскагаспадарчыя спецыяльнасці залічана каля трох тысяч чалавек, і гэта рэкордна высокі паказчык за ўсе апошнія гады. У бягучым годзе ажыццёўлены, зноў жа, рэкордны набор па педагагічным профілі — залічана каля чатырох тысяч чалавек. Выраслі конкурсы на спецыяльнасць «Дашкольная адукацыя».

У якасці прыкладу прадстаўнік адукацыйнага ведамства прывёў Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт, дзе конкурс склаў 1,4 чалавека на месца. Запатрабаваным аказаўся і філалагічны кірунак. Напрыклад, на беларускую мову і літаратуру конкурс склаў 1,7 чалавека на месца. На кожным профільным факультэце галоўнага ўніверсітэта краіны сёлета набрана па дзве групы будучых настаўнікаў фізікі, матэматыкі, інфарматыкі, біялогіі, хіміі і геаграфіі.

## МАТЫВАВАНЫЯ І АДОРАНЫЯ

— Істотна ўзрасла колькасць матываваных і адораных маладых людзей, якія дасягнулі высокіх вынікаў падчас навучання ў школах і каледжах і якія хутка зоймуць свае месцы ў аўдыторыях універсітэтаў, — працягвае аналізаваць Аляксандр Бахановіч. — І гэта якасная характарыстыка цяперашняй уступнай кампаніі.

**У шэрагі студэнтаў прыняты 22 пераможцы міжнародных і больш за 270 пераможцаў рэспубліканскіх алімпіяд, каля 4,5 тысячы медалістаў, 1,7 тысячы ўладальнікаў дыпломаў каледжаў з адзнакай, 135 лепшых выпускнікоў Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка, больш за 20 пераможцаў конкурсаў прафмайстэрства.**

**Студэнтамі сталі больш за 45,5 тысячы чалавек, з іх будуць вучыцца на бюджэце больш як 30,5 тысячы, на платнай аснове — каля 15 тысяч. На сельскагаспадарчыя спецыяльнасці залічана каля трох тысяч чалавек, і гэта рэкордна высокі паказчык за ўсе апошнія гады.**

— Больш за ўсё медалістаў залічылі ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. У топ-5 таксама ўваходзяць БДУІР, БДМУ, БДЭУ і БНТУ. Пераможцы алімпіяд і творчых конкурсаў паступілі ў БДУ, ВДМУ, БДУІР, БДМУ і БДУКМ. Самымі папулярнымі ВНУ сярод уладальнікаў чырвоных дыпломаў каледжаў сталі БДЭУ, БДУІР, ГрДУ ім. Янкі Купалы, БДАМ і БДПУ ім. Максіма Танка, — праінфармаваў Аляксандр Бахановіч і падзяліўся добрымі навінамі ў дачыненні да мэтавікоў: «Пры плане прыёму 6,6 тысячы, дакументы падалі больш за 8 тысяч чалавек. Навучацца па дадзенай траекторыі будзе кожны пяты бюджэтнік».

## РАСЦЕ ЎЗРОВЕНЬ ВЕДАЎ — РАСТУЦЬ КОНКУРСЫ

Першы намеснік міністра адзначыў і такі факт, як рост конкурсаў і прахадных балаў на спецыяльнасці прыродазнаўчага і інжынернага профіляў.

— Напрыклад, на факультэтах БДУ прыкладной матэматыкі і інфарматыкі і механіка-матэматычным прахадныя балы склалі больш за 350 па ўсіх спецыяльнасцях. Такая ж сітуацыя па большасці спецыяльнасцяў у БДУІР, — канкрэтызаваў дзяржслужачы і дадаў, што палепшаны вынікі прыёму абітурыентаў па іншых траекторыях. У 21 рэгіянальную ВНУ на запатрабаваныя эканомікай спецыяльнасці залічана каля 500 пераможцаў універсітэцкіх алімпіяд. І гэта ў 1,3 раза больш за мінулы год.

## СУЧАСНА І ЗРУЧНА

Каментуючы ўведзеную з гэтага года навацыю — папярэдні анлайн-запіс для падачы дакументаў у ВНУ, прадстаўнік Мінадукацыі адзначыў: «Добрае пачынанне і зручны варыянт як для абітурыентаў, якія маглі зрабіць папярэдні запіс на патрэбную іх дату і час, так і для членаў прыёмнай камісіі — адсутнічаюць чэргі, абітурыенты прымаюцца раўнамерна ва ўсе дні прыёму». У мінулую ўступную кампанію каля 15 тысяч абітурыентаў — а гэта кожны трэці — скарысталіся паслугай электроннай чаргі.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор электронных торгов** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | КУП «МИНОБЛАВТОСЕРВИС», 220037, г. Минск, ул. П. Бровки, д. 27. тел. +375 17 356 00 62 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by |

| № лота | Предмет электронных торгов | Начальная цена с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | Легковой джип «**НИССАН X-TRAIL»,** рег. знак 1017 АН-5, 2006 г. в. | **15 846,64** (снижена на 58 %) |
| 2 | Легковой минивэн «**ФОЛЬКСВАГЕН ТУРАН»,** рег. знак 1028 АН-5, 2005 г. в. | **12 060,00** (снижена на 25 %) |
| 3 | Легковой внедорожник универсал (SUN UNIVERSAL) **GEELY EMGRAND X7,** рег. знак 1046 АН-5, 2014 г. в. | **9 024,00** (снижена на 20 %) |

**Местоположение: г. Минск, ул. П. Бровки, д. 27**

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 11.10 15.09.2025**.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:**
заявки на участие в электронных торгах принимаются на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by по **12.09.2025 до 17.00**

**Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на сайтах Минского облисполкома (https://minsk-region.gov.by/) и Госкомимущества (https://au.nca.by/)**

**Контактные телефоны:** +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 317-95-42.
**E-mail:** auction@cpo.by

УНП 100802202



**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
**(Организатор аукциона)**
извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Поставский льнозавод»**

**Аукцион состоится 18.09.2025 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.**

**Лот № 1**

**Линия длинного льноволокна «Vanhauwaert»**

(перечень имущества, входящий в состав Лота № 1, содержится на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by)).

Место нахождения Лота № 1:
**Витебская обл., г. Поставы, ул. Заводская, 1.**

Обременение: залог.
Начальная цена с НДС 20 % – 414 967,56 руб.
Задаток – 41 500,00 руб. Шаг аукциона – 3 %.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, определения лица, выигравшего аукцион, а также условия аукциона содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by).
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X.
Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений и задатка – **16.09.2025 в 11.00.**

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182



**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) информирует о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **Комитету государственного контроля по Минской области** (Продавец).

**Электронные торги состоятся 11.09.2025.**

**Лот № 1:** RENAULT LATITUDE,
кузов (рама) № X7LAB41ZB48270234.

Начальная цена без НДС – 21 420,00 руб.

Местонахождение: г. Минск, ул. П. Бровки, д. 3, корп. 2.

Извещение о проведении электронных торгов размещено на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by).

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182



ИНФОРМАЦИЯ ОБ ОБЪЯВЛЕННОМ АУКЦИОНЕ

**Стайский сельский исполнительный комитет**
**проводит открытый аукцион по продаже земельного участка в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома**

| № п.п. | Месторасположение земельного участка, его площадь и кадастровый номер | Начальная цена, рублей |
|---|---|---|
| 1 | Витебская область, Лепельский район, Стайский с/с, д. Оконо, ул. Советская, 2В, площадь 0,1503 га, кадастровый номер 222783605501000366 | 5000,00 |

Аукцион состоится **26 сентября 2025 года в 14.30** по адресу: **Витебская область, Лепельский район, аг. Стаи, ул. Лепельская, д. 12.**
Контактные телефоны: **8 (02132) 3-25-42, 3-25-74; (29) 3093358.**
Извещение о проведение аукциона опубликовано на официальном сайте Витебского облисполкома, **vitebsk-region.gov.by** и Государственного комитета по имуществу, **https://au.nca.by/auction/32485.**

УНП 300039704

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ООО «Акетон»

| Лот | Наименование | Начальная цена без учета НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. (5 %) | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 2100 | Капитальное строение с инвентарным номером 630/С-67162 (назначение – Здание специализированное иного назначения, наименование – Склад, площадь – 964,1 кв. м) | 1500000,00 | 75000,00 | 75000,00 |

В отношении лота проводятся первые торги

**Местонахождение:** Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Притыцкого, 1А

В отношении кап. строения с инв. № 630/С-67162 имеется обременение (ограничение) в виде аренды

Лот расположен на земельном участке с кадастровым номером 623850100003001735, площадь 0,1568 га (доля в праве – 3/25), целевое назначение – Земельный участок для содержания и обслуживания административно-производственных зданий. Право постоянного пользования

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **16 сентября 2025 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | С 10.00 15 августа 2025 года до 16.00 15 сентября 2025 года |

**Условия для участия в торгах:**
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA 30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: OTHR 40901. Задаток для участия в торгах по Лоту 2100, ООО «Акетон», проводимых 16.09.2025.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов).
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании актов в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста: 2,5 % от конечной цены предмета торгов.** Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 15 (пятнадцати) календарных дней со дня оплаты затрат на организацию и проведение торгов. Оплата приобретенного предмета торгов осуществляется согласно договору купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) календарных дней со дня подписания договора купли-продажи.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться на странице лота на сайте https://orgtorg.by.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов: **+375296665463, Андрей Владимирович (пн – пт с 9.00 до 17.00).**
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании действующего законодательства Республики Беларусь.
9. Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи недвижимого имущества и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **ООО «Акетон» в лице директора Терзяна Андрея Владимировича, тел. +375296665463, rentex0823@gmail.com (222310, Республика Беларусь, Минская область, Молодечненский район, г. Молодечно, ул. Притыцкого, 1А, комн. 1)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |



## ИНФОРМАЦИЯ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ по продаже права заключения договора аренды имущества 23 сентября 2025 года

| № лота | Наименование и местонахождение объекта | Площадь, кв. м | Начальная цена продажи, руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 400/С-112947 (здание кафе): г. Гродно, ш. Скидельское, 2/18** | 358,5 | 1 177,58 |

Срок договора аренды: 3 года.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости»: **8 (152) 62-60-55, 62-60-56.**

**Аукцион состоится 23 сентября 2025 г. в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1, актовый зал.**

**Заявления принимаются по 17 сентября 2025 года**.

Извещение размещено на сайтах: Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **https://au.nca.by**, Гродненского городского исполнительного комитета **http://grodno.gov.by**, ГП «Гродненский центр недвижимости» **http://gcn.by.**

УНП 590727594


# «ПРАЦАВАЦЬ ТРЭБА ШЧЫРА І САМААДДАНА»

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Пачынальнік працоўнай дынастыі Іван Пятровіч Федарэнка з'яўляецца механізатарам вось ужо 29 гадоў. Па прыкладзе бацькі стаў механізатарам і яго сын Аляксандр, які працуе ў ААТ «Азярыцкі-Агра» тры гады. Выдатнае сонечнае надвор'е, якое ўстанавілася ў апошнія дні, дае магчымасць камбайнерам працаваць без замінак, яны выкарыстоўваюць кожную хвіліну.

— Для таго каб дасягнуць высокіх пакзчыкаў, вельмі важна любіць сваю справу. Упэўнена, што ў рабоце механізатара вы знайшлі сваё прызванне... — пачынаю размову з Іванам Пятровічам.

— Так. Я нарадзіўся ў вёсцы Кунцаўшчына Мінскага раёна, а затым мае бацькі пераехалі жыць у вёску Акцябр Лагойскага раёна. Паколькі яны працавалі ў мясцовай гаспадарцы, я добра ведаў, што такое нялёгкая вясковая праца. Разам са сваімі братамі дапамагаў бацькам і разумеў, як шмат часу патрабуе работа ў калгасе.

Скончыўшы дзевяць класаў акцябрскай сярэдняй школы, Іван паступіў у Смалявіцкае дзяржаўнае прафесійна-тэхнічнае вучылішча № 204, дзе набыў спецыяльнасць механізатара. Свой працоўны шлях хлопец пачаў у родным калгасе. Шчыраваў слесарам, механізатарам. Рабоце ў гэтай гаспадарцы Іван Пятровіч аддаў 22 гады. І вось ужо сем гадоў працуе ў ААТ «Азярыцкі-Агра».

— Вядома, што работа на жніве не з лёгкіх. Што дапамагае вам у працы? — пытаюся ў перадавіка.

— Канешне, вельмі дапамагае тое, што працую на сучасным высокатэхналагічным камбайне «Палессе GS2124». У кабіне заўсёды падтрымліваецца аптымальная тэмпература, працэс работы камп'ютарызаваны, таму збояў практычна не бывае. Адзінае, што можа зламаць ход уборачнай, — пагаршэнне надвор'я, — кажа суразмоўца.

— Калі пачынаецца ваш працоўны дзень?

— Выходзім у поле ў восем гадзін, а заканчваем каля 22 гадзін і пазней, — адказвае механізатар. — Скажу шчыра: за працай час заўсёды пралятае вельмі хутка. Наша галоўная мэта — своечасова ўбраць ураджай, таму працуем не звяртаючы ўвагі на час сутак. Калі сваю работу выконваць шчыра і самааддана, яна заўсёды прынясе станоўчы вынік.



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Так лічыць і сын Івана Пятровіча Аляксандр.

Пасля школы ён таксама адвучыўся ў Смалявічах (цяпер там аграрна-тэхнічны ліцэй). Вярнуўшыся з арміі, паўтара года працаваў на пілараме, а затым стаў работнікам гаспадаркі, дзе ўжо не першы год шчыруе бацька.

— Спачатку, канешне, было нялёгка, — расказвае малады механізатар. — Трэба было дэталёва вывучыць спецыфіку работы камбайна. Аднак паступова ўсё стала зразумелым. На работу заўсёды прыходжу з задавальненнем. Працую на камбайне «Палессе GS16». Калі і далей будзе такое выдатнае сонечнае надвор'е, увесь патрэбны аб'ём работ выканаем хутка.

Дарэчы, сямейную справу механізатараў прадоўжылі і два браты Івана Пятровіча — Сяргей і Пётр. Сяргей Пятровіч 20 гадоў быў кіроўцам трактара, камбайнерам на дзяржаўным прадпрыемстве «Спутник-Агра», не адзін год аддаў рабоце механізатара на гэтым прадпрыемстве і Пётр Пятровіч. Цяпер ён працуе трактарыстам у ААТ «Азярыцкі-Агра».

У перыяд уборачнай вольнага часу ў механізатараў практычна няма. Іван Пятровіч падзяліўся, што пасля заканчэння самай гарачай для хлебаробаў пары будзе займацца добраўпарадкаваннем дома, які набыў у вёсцы Арэшнікі. Грошай, якія заробіць на ўборачнай, якраз хопіць, каб давесці ўсё да ладу. А вось Аляксандр у вольны час любіць пагуляць у футбол.

— Вельмі важна, каб моладзь укладвала ў сваю работу душу, — кажа Іван Пятровіч. — Хочацца, каб маладыя работнікі працавалі лепш за нас.

— Рабіць сваю справу заўсёды трэба шчыра і самааддана, тады абавязкова ўсё атрымаецца, — дадае Аляксандр.

Ніхто і не сумняваецца, што будзе менавіта так.

**Святлана СІЛЬВАНОВІЧ.**




З НАГОДЫ

# НА АБАРОНЕ АГРАРНАЙ БЯСПЕКІ

## Чым сёння жыве найстарэйшая кузня сельскагаспадарчых кадраў Беларусі

Сёлетні год для Беларускай дзяржаўнай ордэнаў Кастрычніцкай Рэвалюцыі і Працоўнага Чырвонага Сцяга сельскагаспадарчай акадэміі праходзіць пад знакам 185-годдзя. За перыяд свайго існавання яна падрыхтавала больш чым 110 тысяч высокакваліфікаваных спецыялістаў, многія з якіх сталі вядомымі дзяржаўнымі дзеячамі, вучонымі, кіраўнікамі буйных устаноў і прадпрыемстваў. 24 выпускнікі акадэміі атрымалі званне Героя Сацыялістычнай Працы, два — Героя Савецкага Саюза, 16 — заслужаных дзеячаў навукі і тэхнікі, 60 — заслужаных работнікаў сельскай гаспадаркі.

Акадэмія ў горадзе Горкі Магілёўскай вобласці — адна з найбуйнейшых шматпрофільных устаноў аграпрамысловага кірунку сярод краін СНД і Еўропы. «Я ганаруся сваёй прыналежнасцю да маёй акадэміі. Усім, хто прыйдзе ў яе сцены, жадаю творчага натхнення і паспяховага ўзыходжання да вяршынь ведаў. Маім любімым настаўнікам — мая глыбокая падзяка». Гэтыя словы, якія Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка напісаў на старонках сімвалічнай Кнігі ведаў у галоўным навучальным корпусе, натхняюць юнакоў і дзяўчат, якія жадаюць атрымаць якасную адукацыю і стаць паспяховымі ў сваёй краіне. Дыпломы БДСГА прызнаюцца ў дзясятках краін свету. Гэта сведчыць аб прэстыжнасці і канкурэнтаздольнасці спецыялістаў на рынку працы.

За апошнія пяць гадоў вышэйшая навучальная ўстанова двойчы станавілася лаўрэатам прэміі Урада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў вобласці якасці.

**Рэктар БДСГА Віталь ВЕЛІКАНАЎ** адзначае, што акадэмія заўсёды мела высокі статус сярод іншых вышэйшых навучальных устаноў. Па рэйтынгу uniRank яна займае першае месца сярод беларускіх устаноў вышэйшай адукацыі аграрнага профілю і 13-е сярод 43 ВНУ краіны. На яе рахунку шмат навуковых распрацовак і вынаходніцтваў. Толькі за апошні год у сценах ВНУ створаны 21 від навукова-тэхнічнай прадукцыі.

Тут сур'ёзна працуюць з маладымі вучонымі.

— Калі па нейкіх кірунках не атрымліваецца рабіць гэта ў Беларусі, выходзім на міжнародны ўзровень, — удакладняе Віталь Віктаравіч. — Напрыклад, у нашай краіне няма вучонага савета па меліярацыі, а гэты кірунак для нас вельмі важны. І мы наладзілі адносіны з ВНУ Масквы і Варонежа. Ужо 12 нашых выкладчыкаў там абараніліся.

Наогул, акадэмія дынамічна развівае супрацоўніцтва з замежнымі вышэйшымі навучальнымі ўстановамі. Заключана 160 дагавораў аб супрацоўніцтве, з якіх 20 толькі за апошні год. Сярод партнёраў — Расійскі аграрны дзяржуніверсітэт імя К. Цімеразева, Бурацкая сельскагаспадарчая дзяржакадэмія, Петразаводскі дзяржуніверсітэт і іншыя.

> **Цікавы праект у галіне раслінаводства рэалізуецца з Паўночна-Заходнім універсітэтам сельскай і лясной гаспадаркі Кітая. Па выніках яго атрыманы сумесны беларуска-кітайскі сорт пшаніцы, які сёння праходзіць дзяржвыпрабаванне.**

Асаблівы гонар ВНУ — яе прафесарска-выкладчыцкі склад, амаль 62 % якога мае вучоную ступень. Для параўнання: сярэдні па краіне паказчык — 45 %. Усяго ў акадэміі працуе каля 1450 чалавек.

На дзевяці факультэтах акадэміі вучацца вочна і завочна 7600 студэнтаў, падрыхтоўка вядзецца па 21 спецыяльнасці I ступені і 9 спецыяльнасцях II ступені (магістратура). Больш чым 300 студэнтаў — прадстаўнікі 18 краін свету. Вялікім попытам у абітурыентаў карыстаюцца спецыяльнасці «землеўпарадкаванне і кадастры», «водныя біярэсурсы і аквакультура», «будаўніцтва будынкаў і збудаванняў», «тэхнічны сервіс у АПК», «аграбізнес», «правазнаўства», «маркетынг», «бухгалтарскі ўлік, аналіз і аўдыт», «тэхнічнае забеспячэнне вытворчасці сельгаспрадукцыі», «абарона раслін і каранцін». У бліжэйшы час стартуе праграма падрыхтоўкі механізатараў для Батсваны. У афрыканскай краіны ёсць патрэба ў кароткатэрміновых курсах для гэтых работнікаў. І вучэбны працэс вырашана арганізаваць на базе менавіта Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі.

Шмат увагі тут удзяляецца падрыхтоўцы мэтавікоў (больш падрабязна, як акадэмія працуе ў гэтым кірунку, «Звязда» пісала ў чэрвені). За кожным раёнам Беларусі замацаваныя супрацоўнікі акадэміі, якія сумесна з кіраўнікамі ўпраўленняў па сельскай гаспадарцы і харчаванні вядуць шырокую прафарыентацыйную дзейнасць з навучэнцамі, арганізоўваюць для іх экскурсіі. Сёлета на вучобу ў БДСГА прыйшлі 272 мэтавікі.

— Хочацца падзякаваць усім тым, хто пад свае заяўкі накіраваў адпаведную колькасць чалавек, — адзначае рэктар. — Дзяржкаммаёмасць Рэспублікі Беларусь нам нават конкурс забяспечыў — падаў заяўку на 40 землеўпарадчыкаў, а накіраваў 42 чалавекі. На жаль, не ўсе ўпраўленні па сельскай гаспадарцы і харчаванні дапамагаюць нам рэзультатыўна вырашаць праблему, накіроўваюць нашмат менш чалавек, чым указваюць у заяўках. Прыемна адзначыць, што цікавасць да сельскіх прафесій сёння назіраецца і сярод гараджан. Маладыя людзі разумеюць, што ў гэтай галіне хутчэй змогуць пабудаваць кар'еру, атрымаць дом, машыну.



Сёння акадэмія — буйная установа, цалкам аснашчаная ўсім неабходным для адукацыі, практыкі і адпачынку студэнтаў. Памеры акадэмгарадка ўражваюць. На яго тэрыторыі размешчаны 16 навучальных карпусоў, 14 студэнцкіх інтэрнатаў, бібліятэка з кніжным фондам больш чым адзін мільён экзэмпляраў, Палац культуры, спартыўна-аздараўленчы комплекс з басейнам, лёгкаатлетычным манежам, тэнісным кортам, іншымі спартыўнымі пляцоўкамі, ёсць крамы, банкаматы. А прыгажосцю тутэйшых лакацый захапляюцца ўсе без выключэння — каскад азёр, багаты раслінны свет. Горкі за гэту прыгажосць нават называюць невялічкай беларускай Швейцарыяй. Уражвае разнастайнасцю форм і разнавіднасцяў расліннага свету адзін з найстарэйшых Батанічных садоў Беларусі, які быў заснаваны ў 1847 годзе яшчэ пры Гарыгарэцкай земляробчай школе. У яго аранжарэі сабраныя сотні экзатычных дрэў і раслін, у тым ліку з тропікаў і субтропікаў.

Установа мае багатую і цікавую гісторыю. У яе музеі захоўваецца шмат рэдкіх прадметаў і дакументаў. Убачыць іх можна нават на адлегласці. На сайце акадэміі ёсць некалькі віртуальных экскурсій, зробленых з дапамогай 3D-тэхналогій.

Тут ганарацца сучаснымі аб'ектамі, якія забяспечваюць якасную падрыхтоўку спецыялістаў. Сярод іх значацца вучэбны палігон, пладагадавальнік, дыягнастычная станцыя. На базе акадэміі ў 2018 годзе быў створаны «Тэхнапарк «Горкі», у 2020-м укаранёныя трэнажоры па аквакультуры, якія выкарыстоўваюцца пры падрыхтоўцы спецыялістаў для рыбагаспадарчай галіны.

— Для нас стала добрай традыцыяй да 1 верасня новага навучальнага года адкрываць чарговы інавацыйны аб'ект, — падкрэслівае кіраўнік ВНУ. — З 2021 года у нас з'явіліся вучэбна-выставачны цэнтр з лабараторыяй інавацыйнай сельгастэхнікі, лабараторыі дакладнага земляробства і ўзнаўлення сельскагаспадарчых жывёл, спецыялізаваная вучэбная аўдыторыя «Міжнародны цэнтр перамоў», навукова-адукацыйны цэнтр «Лічбавая жывёлагадоўля», Беларуска-Кітайскі цэнтр сельскагаспадарчай біятэхналогіі і штучнага інтэлекту» і іншыя. Сёлета, у свой юбілейны год, адкрываем новыя лабараторыі пры вучэбна-практычным цэнтры па прыродаўладкаванні і будаўніцтве, а таксама пры навукова-адукацыйным цэнтры «Лічбавая жывёлагадоўля». Для нас вельмі важна забяспечыць высокую якасць адукацыі і падрыхтаваць годнага спецыяліста для сваёй дзяржавы.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з сайта БДСГА.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## ОАО «Н Холдинг» проводит открытый аукцион по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности ОАО «МПОВТ»

**Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Н Холдинг» по организации и проведению аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **ЛОТ № 1** | Капитальное строение с инв. № 600/С-182237, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/15, вблизи аг. Колодищи. Площадь: 1017,1 кв. м. Наименование: Ангар (инв. № 40388). Назначение: Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: 15А1/к-Ангар (инв. № 40388). Обременение: аренда. Капитальное строение с инв. № 600/С-182227, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/16, вблизи аг. Колодищи. Площадь: 4,4 кв. м. Наименование: Туалет на 2 очка № 2 (инв. № 32945). Назначение: Здание санитарно-бытового назначения. Составные части и принадлежности: 16А1/к-Туалет на 2 очка № 2 (инв. № 32945). Капитальные строения расположены на земельном участке с кадастровым номером 623683400001000692 площадью 9,7659 га, предоставленном ОАО «МПОВТ» на праве постоянного пользования (срок действия: не установлен). На земельном участке установлены следующие ограничения (обременения): зона санитарной охраны источников артскважина № 32265/78, площадь 9,7659 га | | | | |
| **Начальная цена (стоимость) (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **632 845,92** | **Задаток, BYN** | **63 284,59** | **Шаг аукциона** | **5 %** |
| **ЛОТ № 2** | Капитальное строение с инв. № 600/С-182232, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/18, вблизи аг. Колодищи. Площадь: 22,7 кв. м. Наименование: Диспетчерская (114-й цех) (инв. № 32955). Назначение: Здание специализированное иного назначения. Составные части и принадлежности: 18А1/к-Диспетчерская (114-й цех) (инв. № 32955). Капитальное строение с инв. № 600/С-182223, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/17, вблизи аг. Колодищи. Площадь: 792,7 кв. м. Наименование: Склад (инв. № 28936). Назначение: Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: 17А1/к-Склад (инв. № 28936), 1-Пристройка, 2-Пристройка, 3-Пристройка. Обременение: аренда. Капитальное строение с инв. № 600/С-182239, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/19, вблизи аг. Колодищи. Площадь: 420,4 кв. м. Наименование: Механизированный склад кубовых отходов МПП-33100 (инв. № 41114). Назначение: Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: 19А1/м-Механизированный склад кубовых отходов МПП-31100 (инв. № 41114). Обременение: аренда. Капитальные строения расположены на земельном участке с кадастровым номером 623683400001000692 площадью 9,7659 га, предоставленном ОАО «МПОВТ» на праве постоянного пользования (срок действия: не установлен). На земельном участке установлены следующие ограничения (обременения): зона санитарной охраны источников артскважина № 32265/78, площадь 9,7659 га | | | | |
| **Начальная цена (стоимость) (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **921 737,88** | **Задаток, BYN** | **92 173,79** | **Шаг аукциона** | **5%** |
| **Сведения о продавце, его местонахождение и контактные телефоны** | ОАО «МПОВТ» Республика Беларусь, 220140, г. Минск, ул. Притыцкого, д. 62. Тел. +375 (17) 388 90 99. E-mail: mpovt@mpovt.by | | | | |
| **Сведения об организаторе аукциона** | ОАО «Н Холдинг» 220029, г. Минск, пр-т Машерова, 11, пом. 1. Тел. 8 029 754 63 46 (Мария) | | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | Договор купли-продажи должен быть заключен в течение **10 (десяти) рабочих дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона** | Победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, в течение 5 (пяти) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона, а также в течение 3 (трех) рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона выплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 3 % от цены продажи предмета аукциона на основании счета, выставленного организатором аукциона | | | | |
| **Условия оплаты** | Оплата задатка производится резидентами в белорусских рублях (нерезидентами в белорусских рублях или в долларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты) не позднее дня подачи заявления на участие в аукционе на следующие банковские реквизиты: р/с BY79 AKBB 3012 0000 1634 1000 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, 220005, г. Минск, пр-т Независимости, 56. Получатель – открытое акционерное общество «Н Холдинг», УНН 101059240, ОКПО 37392696. Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты объекта, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Место, дата и время приема заявлений на участие в аукционе** | Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **по 15 сентября 2025 г. включительно** в рабочие дни с 9.00 до 16.55 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35-1 | | | | |
| **Место, дата и время проведения аукциона** | Аукцион состоится **16 сентября 2025 года** по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, 35-1, зал совещаний ОАО «Н Холдинг»: по Лоту № 1 в 11.00; по Лоту № 2 в 15.00 | | | | |

Организатор аукциона после опубликования извещения о его проведении вправе в любое время без объяснения причин, но не позднее чем за 3 календарных дня до даты проведения аукциона, указанной в извещении о проведении аукциона, отказаться от проведения аукциона

# ТРЫМАЦЦА ПРАВІЛЬНАГА ХАРЧАВАННЯ ВАРТА З МАЛАДОСЦІ

**Урачы пра тое, як паклапаціцца аб сваім страваванні**



На працягу апошніх двух дзесяцігоддзяў у Беларусі назіраецца зніжэнне захваральнасці органаў страўнікава-кішачнага тракта сярод дзяцей. У пачатку 2000-х гадоў яна знаходзілася на 2-3 месцы, цяпер жа паталогіі гэтай групы займаюць 5-6 месцы, саступаючы захворванням органаў зроку, дыхальнай сістэмы, апорна-рухальнага апарату і скуры.

## ЗА ПРАГРЭСАМ — НОВЫЯ ПАГРОЗЫ

Усё дзякуючы ўкараненню клінічных пратаколаў і сучасных метадаў дыягностыкі. Сярод іх — найноўшыя віды эндаскапічных даследаванняў: эндасанаграфія, малаінвазіўныя аперацыі, сучасная прамянёвая дыягностыка, камп'ютарная тамаграфія, МРТ і інш.

Тым не менш, за апошнія 10-15 гадоў медыкі фіксуюць рост хвароб, якія раней сустракаліся ў асноўным у дарослых. Да іх адносяцца запаленчыя захворванні кішэчніка, уключаючы хваробу Крона і язвавы каліт, эразіўная форма гастраэзафагеяльнай рэфлюкснай хваробы, неінфекцыйныя гепатыты, жоўцекаменная хвароба. Усё часцей у дзяцей выяўляюць неалкагольную тлушчавую хваробу печані і цэліякію — праўда, апошняя «вырасла» ў статыстыцы не з-за ўсплёску, а дзякуючы з'яўленню больш дакладнай яе дыягностыкі.



Прычым шэраг захворванняў **страўнікава-кішачнага тракта** з'яўляецца следствам аднаго з галоўных «нябачных» ворагаў нашага арганізма — стрэсу. Ён можа стаць прычынай перыядання ці недаядання, што ў выніку прывядзе да гастрыту, язваў і функцыянальных расстройстваў. Для іх прафілактыкі, паводле слоў спецыялістаў, патрэбна падтрымліваць рэжым харчавання, збалансаваны рацыён, фізічную актыўнасць і эмацыйна здаровую атмасферу ў сям'і.

Выконваць гэтыя рэкамендацыі важна не толькі дзецям, але і дарослым. Напрыклад, гастраэзафагеяльная рэфлюксная хвароба часта развіваецца ад пераядання. Прыём ежы перад сном і гарызантальнае становішча прыводзяць да таго, што ў стрававод трапляе саляная кіслата. У такіх выпадках магчымы апёк слізістай, кашаль і нават прыступы, якія нагадваюць астму. Для прафілактыкі важна вячэраць за тры гадзіны перад сном, пазбягаць цяжкай ежы. А прагулка перад сном можа стаць не толькі карысная звычкай, але і прыемным баўленнем часу.

Нарэшце, нельга забываць і аб гігіене харчавання:

— Выгляд і прыемны пах страваў запускаюць выпрацоўку сліны і страўнікавых сокаў, падрыхтоўваючы стрававальны тракт да працы. Перажоўванне ежы забяспечвае правільнае перасоўванне па страваводзе і паўнавартаснае пераварванне. Гэта, у сваю чаргу, зніжае рызыку ўздуцця, цяжкасці, адрыжкі і запораў. Па сутнасці, якаснае, збалансаванае харчаванне — гэта добры будаўнічы матэрыял для нашага арганізма, — канстатуе загадчыца гастраэнтэралагічнага аддзялення № 1 10-й гарадской клінічнай бальніцы, **галоўны пазаштатны гастраэнтэролаг камітэта аховы здароўя горада Мінска Вольга ПАНЕС.**

## НЕБЯСПЕКА НА ТАЛЕРЦЫ

Ні для кога не сакрэт, што існуюць прадукты, здольныя выклікаць дыскамфорт у целе. Чыпсы і іншы фастфуд маюць грубую структуру і механічна раздражняюць слізістую абалонку страўніка. Вострыя стравы, маянэз, кетчуп, газіраваныя напоі часам выклікаюць непрыемныя адчуванні ў страўніку. Газаўтварэнне ўзмацняецца і пры ўжыванні капусты і бабовых. Каб выключыць гэтыя сімптомы, урачы раяць абмяжаваць іх ужыванне або падстрахавацца кропам і фенхелем, у тым ліку ў складзе лекавых прэпаратаў.

